# Акцыя «Падорым разам Новы год».

## Супрацоўнікі ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» віншуюць са святамі Раства Хрыстова і Новага года.

Напярэдадні свята Раства Хрыстова спецыялісты і сацыяльныя работнікі аддзялення сацыяльнай дапамогі на даму ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання Ашмянскага раёна», валанцёры - школьнікі Кальчунскай СШ і стараста аг. Кальчуны правялі акцыю «Падорым разам Новы год». З надыходзячымі святамі былі павіншаваны пажылыя і адзінокія людзі, «гасцявыя» і «прыёмныя» сем'і, жыхары Дома сумеснага самастойнага пражывання. Не засталіся без увагі і віншаванняў ветэраны і ўдзельнікі вайны.

Супрацоўнікі аддзялення сацыяльнай дапамогі на даму стварылі і падпісалі больш чым пяцьсот паштовак, каб парадаваць сваіх падапечных і падарыць ім часцінку свайго душэўнага цяпла. Час, праведзены разам, дапамаг акунуцца ў святочную атмасферу Навагодніх і Калядных святаў: гучалі песні, Дзед Мароз і Снягурка дарылі салодкія падарункі і, нягледзячы на ўзрост, як у дзяцінстве вадзілі карагоды і расказвалі вершы пра Новы год.



